***Праблемныя пытанні.*** Якія фактары абумовілі размяшчэнне ў Жлобіне металургічнага завода, а ў Светлагорску — аб'яднання «СветлагорскХімвалакно» і цэлюлозна-кардоннага камбіната?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Падрыхтуйце паведамленні пра буйныя гарады вобласці.

# § 47. Гродзенская вобласць

***Успомніце.*** *У межах якой фізіка-геаграфічнай правінцыі ў асноўным размешчана Гродзенская вобласць? Якое тапанімічнае значэнне мае айконім Гродна?*

**1. Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Удзельная вага ВРП Гродзенскай вобласці ў фарміраванні ВУП складае 10,9 % (пятае месца ў краіне). Гродзенская вобласць па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці знаходзіцца на шостым месцы, а па вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі — на трэцім (мал. 145).

Па карце атласа (с. 79) вызначце ўдзельную вагу вобласці ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча вобласці.** Гродзенская вобласць самая маленькая ў краіне па плошчы — 25,1 тыс. км$^2$. Яна размешчана на паўночным захадзе краіны. На захадзе мяжуе з Польшчай, на паўночным захадзе — з Літвой. У апошнія гады транзітнае значэнне вобласці знізілася.

**3. Прыродныя рэсурсы.** Карысных выкапняў у вобласці адносна няшмат і звязаны яны ў асноўным з чацвярцічнымі адкладамі. Распрацоўваюцца радовішчы торфу, здабываюцца сапрапелі, цэментныя гліны, будаўнічыя пяскі, пясчана-жвіровы матэрыял. У Ваўкавыскім і Гродзенскім раёнах распрацоўваюцца адны з найбуйнейшых у краіне радовішчаў мелу і мергелю. Адкрыта Навасёлкаўскае радовішча жалезных руд.

Тэрыторыя вобласці характарызуецца разнастайным рэльефам: узвышшы чаргуюцца з раўнінамі і нізінамі. Тут знаходзяцца Навагрудскае і Ашмянскае ўзвышшы з адзнакамі вышэй за 300 м, а таксама самы нізкі пункт краіны.

Знайдзіце на карце атласа (с. 6–7, 78) узвышшы і іх найвышэйшыя адзнакі, а таксама самы нізкі пункт.

У глебавым покрыве пераважаюць даволі ўрадлівыя дзярнова-падзолістыя супясчаныя глебы. У структуры зямельнага фонду вобласці сельскагаспадарчыя землі займаюць 47,5 % (першае месца ў краіне), а разаранасць складае каля 32 %.

Агракліматычныя рэсурсы спрыяльныя для развіцця сельскай гаспадаркі: даволі доўгі вегетацыйны перыяд, цёплае ўмерана вільготнае лета, цёплая і вільготная зіма, дастаткова вялікая колькасць ападкаў. Вобласць забяспечана воднымі рэсурсамі. Тут высокія паказчыкі гушчыні рачной сеткі і рачнога сцёку. Вобласць размешчана ў басейнах Нёмана і Віліі — рэк з высокім гідраэнергетычным патэнцыялам. На паўднёвым усходзе знаходзіцца маляўнічае возера Свіцязь.

Знайдзіце на картах атласа (с. 6–7, 78) найбуйнейшыя рэкі, якія працякаюць па тэрыторыі вобласці, іх прытокі і ўспомніце асаблівасці іх гідралагічнага рэжыму.

Гродзенская вобласць характарызуецца найменшай лясістасцю (36 %). Нягледзячы на гэта, лясы ў межах вобласці месцамі ўтвараюць буйныя масівы-пушчы (Налібоцкая і інш.). Прыродаахоўныя тэрыторыі займаюць 10,1 % тэрыторыі вобласці. На поўдні знаходзіцца частка НП «Белавежская пушча», на ўсходзе — заказніка «Налібоцкая пушча», на паўночным усходзе — НП «Нарачанскі». Усяго ў вобласці каля 110 заказнікаў і помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння і значна больш — мясцовага значэння.

**4. Насельніцтва.** Па колькасці насельніцтва (992,6 тыс. чал.) Гродзенская вобласць займае шостае месца ў краіне. У гарадах пражывае каля 77 % насельніцтва. Шчыльнасць насельніцтва (40 чал./км$^2$) самая высокая. У нацыянальным складзе пераважаюць беларусы, але іх удзельная вага самая нізкая ў краіне (каля 68,3 %). Другое месца займаюць палякі (21,7 %). Даволі шмат у вобласці рускіх (6,4 %).

**5. Прамысловасць.** На долю прамысловасці прыпадае 30,9 % ВРП (мал. 153). У Гродзенскай вобласці працуе больш за 1300 прадпрыемстваў. У структуры апрацоўчай прамысловасці вядучую ролю адыгрываюць харчовая і хімічная прамысловасць.




Мал. 153. Структура ВРП Гродзенскай вобласці, 2023 г., %

Гродзенская вобласць — буйны вытворца мяса і каўбасных вырабаў, малочных прадуктаў, дзіцячага харчавання, мукамольна-крупяных прадуктаў, сыроў, цукру і інш. Прадпрыемствы размяшчаюцца больш чым у 40 гарадскіх і сельскіх паселішчах вобласці. Чаму харчовая прамысловасць з'яўляецца вядучай у вобласці і мае такую разгалінаваную сетку прадпрыемстваў?

Вобласць выпрабляе азотныя ўгнаенні, аміяк, капралактам, кордныя тканіны, пластмасавыя вырабы, хімічныя валокны і ніткі, лакі і фарбы. Прадпрыемствы машынабудавання размяшчаюцца ва ўсіх буйных гарадах вобласці. Тут вырабляецца 100 % бульбакапалак, больш за палову трактарных плугоў, сеялкі, малагабарытныя трактары, электраабсталяванне.

Назавіце прадпрыемствы па вытворчасці пералічанай прадукцыі.

Знайдзіце на карце атласа (с. 79) найбуйнейшыя прадпрыемствы машынабудавання.

У вобласці размяшчаюцца прадпрыемствы па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. У Ваўкавыскім раёне вырабляюцца цэмент і шыфер, керамічныя вырабы. Бярозаўка славіцца прадукцыяй шклозавода «Нёман». У многіх гарадах выпускаюцца вырабы з дрэва, мэбля, у Слоніме — папера і кардон. У Гродзенскай вобласці выпускаюцца трыкатажныя вырабы, абутак, панчошна-шкарпэткавыя вырабы. Створана свабодная эканамічная зона «Гроднаінвест» з рэзідэнтамі ва ўсіх буйных гарадах вобласці.

Малая колькасць распрацаваных радовішчаў карысных выкапняў абумовіла нізкую долю горназдабыўной прамысловасці. Найбуйнейшае прадпрыемства працуе ў пасёлку Краснасельскі.

Узрасла роля Гродзенскай вобласці ў вытворчасці і размеркаванні электраэнергіі. Найбуйнейшае прадпрыемства галіны — Беларуская АЭС у Астраўцы, на долю якой прыпадае 15,1 % выпрацоўкі электраэнергіі краіны. Па вытворчасці цеплавой электраэнергіі вылучаецца Гродзенская ЦЭЦ. У вобласці развітая гідраэлектраэнергетыка. Развіваецца і альтэрнатыўная электраэнергетыка, перш за ўсё ВЭУ.

Чаму ў Гродзенскай вобласці колькасць ГЭС большая, чым у іншых абласцях?

**6. Структура і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.** У структуры ВРП Гродзенскай вобласці доля сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі — 10,9 %. Вобласць спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, збожжавай гаспадарцы, вырошчванні буракоў і бульбаводстве. У структуры пасяўных плошчаў найбольшыя плошчы (45 %) займаюць збожжавыя культуры.

Гродзенская вобласць — лідар у краіне па ўраджайнасці збожжавых культур (47 ц/га). Займае першае месца па валавых зборах цукровых буракоў, сярод лідараў па вырошчванні бульбы, рапсу.

Вобласць лідзіруе па пагалоўі свіней, а па пагалоўі буйной рагатай жывёлы саступае толькі Мінскай і Брэсцкай абласцям. Па валавой вытворчасці мяса і малака займае трэцяе месца.

**7. Геаграфія сферы паслуг.** Доля сферы паслуг у структуры ВРП вобласці — 40,2 %. Нягледзячы на выгаднасць геаграфічнага становішча, аб'ём аказання транспартных паслуг у Гродзенскай вобласці невялікі, бо адсутнічаюць транс'еўрапейскія транспартныя калідоры. Сетка аўтамабільных дарог з цвёрдым пакрыццём самая высокая ў краіне — каля 540 км/1000 км$^2$. У вобласці мала магістральных чыгунак, транспартна-лагістычных цэнтраў.

У Гродзенскай вобласці толькі тры ўстановы вышэйшай адукацыі. Найбуйнейшыя аб'екты сацыяльнай сферы размешчаны ў Гродне, *Лідзе*, Слоніме. Шмат у вобласці рэкрэацыйных аб'ектаў.

Найбольш вядомыя помнікі архітэктуры Гродзенскай вобласці: Мірскі і Лідскі замкі, Стары замак і Свята-Барыса-Глебская (Каложская) царква ў Гродне, царква-крэпасць у Сынкавічах, Жыровіцкі Свята-Успенскі мужчынскі манастыр, Траецкі касцёл у Гервятах (мал. 154). Мірскі замак і пункты Дугі Струвэ з'яўляюцца помнікамі Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Дзяржавай праводзіцца праца па кансервацыі і рэстаўрацыі Навагрудскага замка і замкаў у Крэве і Гальшанах. Пры падтрымцы дзяржавы рэстаўрыраваны Стары замак у Гродне.



*а*



*б*

Мал. 154. Помнікі архітэктуры Гродзенскай вобласці:
*а* — Траецкі касцёл, аг. Гервяты; *б* — Стары замак у Гродне

Прааналізуйце карты атласа (с. 61—71) і знайдзіце аб'екты сферы паслуг вобласці.

**8. Найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры вобласці. Гродна** размяшчаецца недалёка ад мяжы з Польшчай на рацэ Нёман. Гэта адзін з найбуйнейшых прамысловых і культурных цэнтраў Беларусі. Па колькасці насельніцтва (361,1 тыс. жыхароў) Гродна займае чацвёртае месца ў краіне. У горадзе больш за 60 прадпрыемстваў. Галоўнай галіной з'яўляецца хімічная прамысловасць. Таксама ў Гродне вырабляюцца мэбля, абутак, адзенне, прадукты харчавання. У Гродне развітая сфера паслуг. Тут працуюць тры ўніверсітэты, Вышэйшая духоўная каталіцкая семінарыя, больш за 20 каледжаў і ліцэяў. Шмат музеяў, у тым ліку адзіны ў краіне Музей гісторыі рэлігіі, тэатры, філармонія, найстарэйшы ў Беларусі заапарк.

На якой сыравіне працуе найбуйнейшае прадпрыемства горада — «Гродна Азот», якую прадукцыю яно выпрабляе?

Гродна — адзін з гарадоў Беларусі, дзе захавалася старадаўняя планіроўка і вялікая колькасць помнікаў гісторыі і архітэктуры XII–XX стст. Гістарычны цэнтр горада з'яўляецца помнікам горадабудаўніцтва, таму што там захаваліся помнікі старажытнарускага дойлідства, готыкі, рэнесансу, барока, класіцызму і іншых кірункаў. Гродна па праве называюць горадам-музеем пад адкрытым небам.

Другім па колькасці насельніцтва з'яўляецца **Ліда** (103,9 тыс. жыхароў). Знаходзіцца ў цэнтры вобласці. Асноўная галіна прамысловасці горада — сельскагаспадарчае машынабудаванне. Выпрабляюцца аўтобусы. Шмат прадпрыемстваў хімічнай, харчовай і лёгкай прамысловасці. Горад мае вялікае транспартнае значэнне, гэта другі ў вобласці цэнтр фарміравання грузаў.

Лідскі замак — сапраўднае ўпрыгажэнне горада, помнік абарончай архітэктуры XIV ст., аб'ект для наведвання замежнымі турыстамі.

**9. Знешнеэканамічныя сувязі.** Асноўныя віды тавараў, якія экспартуюцца: мясная і малочная прадукцыя, алей рапсавы, драўняна-валакністыя і драўняна-стружкавыя пліты, поліаміды, азотныя ўгнаенні, мэбля, шкло паліраванае, панчошна-шкарпэткавыя вырабы, цукар.

**Падвядзём вынікі.** Гродзенская вобласць — самая маленькая па плошчы ў Беларусі. Характарызуецца самай высокай ураджайнасцю сельскагаспадарчых культур. Вядучая ў краіне па вытворчасці азотных угнаенняў, аміяку, кордных тканін, літага шкла, панчошна-шкарпэткавых вырабаў. У вобласці вялікая колькасць архітэктурна-гістарычных помнікаў.

***Праверце сябе.*** 1. У чым выяўляецца ўнікальнасць рэльефу Гродзенскай вобласці? 2. Якая прадукцыя хімічнай прамысловасці выпускаецца ў Гродзенскай вобласці? 3. Якія помнікі гісторыка-культурнай спадчыны захаваліся на тэрыторыі Гродзенскай вобласці?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Растлумачце асаблівасці нацыянальнага складу насельніцтва Гродзенскай вобласці. 2. Якая спецыялізацыя прамысловасці Гродзенскай вобласці? Якія віды прамысловай прадукцыі выпрацоўваюцца толькі ў Гродзенскай вобласці і чаму?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце турыстычныя маршруты па Гродзенскай вобласці.

## § 48. Мінская вобласць

***Успомніце.*** *У якой частцы вобласці найбольш распаўсюджаны ўзвышшы?*

**1. Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Удзельная вага валавога рэгіянальнага прадукту Мінскай вобласці ў фарміраванні ВУП краіны складае 19 %. Большы гэты паказчык толькі ў Мінску. Мінская вобласць па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці і вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі знаходзіцца на першым месцы (гл. мал. 145).

Па карце атласа (с. 83) вызначце ўдзельную вагу вобласці ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча вобласці.** Мінская вобласць знаходзіцца ў цэнтры Беларусі і выцягнута з поўначы на поўдзень. Гэта адзіная з абласцей краіны, якая не мае знешніх межаў, затое мяжуе з усімі пяццю абласцямі. Па плошчы (40,2 тыс. км$^2$) яна саступае толькі Гомельскай вобласці. Геаграфічнае становішча вобласці выгаднае з эканамічнага пункту гледжання ў сувязі з цэнтральнасцю і размяшчэннем у ёй сталіцы краіны.

**3. Прыродныя рэсурсы.** Мінская вобласць добра забяспечана мінеральнымі рэсурсамі. Распрацоўваецца Старобінскае радовішча калійных і каменнай солей, а таксама радовішчы торфу, будаўнічых пяскоў, пясчана-жвіровага матэрыялу, цагельных глін, сапрапеляў. Адкрыта Акалаўскае радовішча жалезных руд і Любанскае радовішча гаручых сланцаў.

Глебавае покрыва вобласці характарызуецца перавагай дзярнова-падзолістых і дзярнова-падзолістых забалочаных глеб. У структуры зямельнага фонду вобласці сельскагаспадарчыя землі займаюць каля 43 % тэрыторыі (саступае толькі Гродзенскай вобласці). Доля ворных глеб у Мінскай вобласці самая высокая ў краіне — больш за 33 %.